**Литература**

1 Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII, в 3 т. Т. 1 – М.: «Весь мир», 2007 – 551 с.

2 Мерцалова, М. Н. Костюм разных времен и народов. В 4 т. – М..: АО «Академия моды», 1993 – 543 с.

***А. А. Васіленка***
*Навук. кіраўнік* ***В. М. Сідорэнка,***
*асістэнт*

## ТАВАРЫ І ПАСЛУГІ ДЛЯ ЖАНЧЫН НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ "НАША НІВА"

Мэта дадзенай работы: прааналізаваць накіраванасць аб'яў, якія змяшчаліся ў першай беларускамоўнай газеце "Наша ніва" (1906–1916 гг.), арыентаваных на жаночую аудыторыю. Газета "Наша Ніва" з'яўляецца важнай крыніцай аб сацыяльна-эканамічным і грамадскім становішчы жанчын на Беларусі ў пачатку 20 ст. На яе старонках мясціліся рэкламныя публікацыі тавараў і паслуг, якімі маглі карыстацца жанчыны. Магчыма вылучыць аб'явы, што прапаноўвалі жанчынам адзенне і абутак, тавары санітарна-гігіенічнага характару, друкаваныя выданні, прылады працы, касметычныя сродкі і паслугі. У сувязі з ростам грамадскай і эканамічнай актыўнасці жанчын карысталіся попытам аб'явы аб вакансіях і дадатковых заробках. Напрыклад, у нумары 17 за 1909 г. згадваюцца курсы краваецтва ў дырэктара Дрэздэнскай акадэміі, які прымае вучняў, "вучыць англіцкай і нямецкай рабоце" [1, с. 480]. На пачатку 20 ст. жанчыны атрымалі магчымасць самастойна утрымліваць сябе. Гэта дазваляла знізіць іх фінансавую залежнасць ад мужчыны (бацькі ці мужа).

На старонках "Нашай нівы" змяшчаецца інфармацыя аб коштах на некаторыя тавары і паслугі. Дамская цырульніца Казіміра Бржеская выраблялa прычоскі, "завіўку, па апошняй модзе" па кошту 75 кап. [1, с. 648]. Адной з сацыяльных хвароб беларускага грамадства пачатку 20 ст. было п'янства. Ад яго наступстваў цярпела найбольш жанчына, бо станавілася ахвярай. Папулярнасць атрымалі спецыяльныя "медыцынскія прэпараты". Як сведчыла адна з аб'яў "прэпарат "Алкола" не толькі знішчаў запал да напояў, але нават прывіваў агіду да паху віна" [1, с. 600].

Жыццё жанчын, перад ўсім гараджанак, хутчэй адыходзіла ад традыцыйных схем. Назіраліся змены ў формах баўлення вольнага часу. Аб гэтым сведчаць аб'явы аб выставах, лекцыях, канцэртах, адкрытых чытаннях. У газеце таксама рэкламаваліся спецыяльныя друкаваныя выданні для жанчын, прыводзіліся звесткі аб адкрыцці падпіскі.

Такім чынам, газета "Наша Ніва" на сваіх старонках мясціла пэўную колькасць рэкламы, накіраванай на жаночую аудыторыю. На пачатку 20 ст. эканамічная, сацыяльная і нават псіхалагічная залежнасць жанчын ад мужчын імкліва змяншалася, аб чым сведчаць матэрыялы "Нашай нівы".

**Літаратура**

1 Наша ніва. Першая беларуская газета з рысункамі. Вып.:1909. – М.: Тэхналогія, 1998. – 800 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ